Источник: "Звязда" - 2018-03-16

■ Праблема і рашэнне

# Зубры сыходзяць, трэба іх вярнуць

## Як праект «Ветландс» плануе захоўваць рэдкія віды жывёл, і навошта нам патрэбны галандскія тарпаны

**Налібоцкая пушча — першае ў Беларусі месца, дзе ў свой час была створана папуляцыя зуброў, якія жывуць на волі (дагэтуль рэдкіх жывёл трымалі ў вальерах). І калі 20 гадоў таму яна бесперапынна расла, то сёння паказчыкі нараджальнасці знізіліся да нуля. Акрамя таго, жывёлы пачалі пакідаць лясны масіў і выходзіць «у людзі». Прычын такіх змен некалькі, але асноўныя — недахоп ежы і зарастанне тэрыторый, на якіх зубры пасвяцца, упэўнены спецыялісты.**

СТАР. 4



Фота Андрэя ШЫМЧУКА.

Источник: "Звязда" - 2018-03-16

# Зубры сыходзяць...

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

Вырашыць праблемы павінен пяцігадовы праект «Устойлівае кіраванне ляснымі і водна-балотнымі экасістэмамі для дасягнення шматмэтавых пераваг» («Ветландс»), які фінансуецца Глабальным экалагічным фондам і рэалізуецца Праграмай развіцця ААН сумесна з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

— Наша задача — захаваць і аднавіць месцапражыванні раслін і жывёл, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення, а таксама палепшыць кармавыя ўгоддзі для вольна жывучай налібоцкай мікрапапуляцыі зуброў, — адзначае **начальнік упраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды Мікалай СВІДЗІНСКІ.** — Сёння там 200 га тэрыторыі знаходзіцца ў дэструктыўным стане. Зубры сыходзяць, трэба іх вярнуць.

Для гэтага плануецца стварыць канвеер, які забяспечыць жывёл зялёнымі кармамі з ранняй вясны да позняй восені, а таксама ацаніць генетычны патэнцыял зуброў і, па магчымасці, аздаравіць папуляцыю.

— Зубра можна назваць лясной каровай. А ў беларускіх лясах амаль не засталося адкрытых участкаў з зялёнай расліннасцю, якія б не зараслі хмызнякамі. Заросла і вада. Мы плануем расчысціць каля 300 га і пракантраляваць, каб гэтыя мерапрыемствы праводзіліся рэгулярна, — падкрэсліў **загадчык сектара міжнароднага супрацоўніцтва і суправаджэння прыродаахоўных канвенцый НПЦ па біярэсурсах НАН Беларусі, навуковы каардынатар праекта Аляксандр КАЗУЛІН.**


Турападобная карова.

Па словах спецыяліста, у рамках праекта таксама будзе працягнута дзейнасць па выдаленні раслінасці з нізінных балот і пойменных лугоў, у тым ліку на тэрыторыі заказнікаў «Спораўскі» і «Званец», якая была распачата яшчэ падчас праекта «Кліма-Іст». Вядома, без увагі не застанецца і Тураўскі луг — унікальная тэрыторыя, праз якую пралягаюць міграцыйныя шляхі соцень тысяч птушак, у тым ліку і рэдкіх.

— На працягу 20 гадоў мы маніторым колькасць птушак на пойменных лугах. І з кожным годам іх становіцца ўсё менш. Так, амаль у два разы скарацілася колькасць кулікоў, практычна зніклі марадункі і кнігаўкі (а гэта не глабальна пагражаемы від), — падкрэсліла **вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі арніталогіі НПЦ па біярэсурсах Наталля КАРЛІЁНАВА.** — Безумоўна, прынятыя меры, напрыклад, кіруемае выпальванне сухой расліннасці, паляпшаюць сітуацыю, але без комплекснага падыходу станоўчы эфект доўга не працягнецца. Вось не стала ў прыватных гаспадарках кароў, перасталі мясцовыя жыхары пасвіць жывёл на пойменным лузе — і ён зарос.

Дарэчы, свойскім жывёлам, своеасаблівым «санітарам» лугоў, якіх сёння ў многіх месцах для выканання гэтай місіі не хапае, у праекце «Ветландс» прадугледжана цікавая альтэрнатыва. Аляксандр Казулін расказаў, што ў хуткім часе ў Беларусі могуць з'явіцца вольна жывучыя тарпаны і турападобныя каровы. Жывёл плануецца прывезці з Галандыі, дзе іх паспяхова разводзяць ужо на працягу некалькіх гадоў. Так што хутка ў нашых зуброў з'явіцца цікавая кампанія.

**Кацярына ЦІТОВА.**


Тарпан.